к внутреннему миру субъекта. Ценности достоинства, совести, свободы и самосовершенствования ориентируют современного человека на их преломление в поступках, что формирует его творческую способность вносить коррективы в свои ориентации и установки, в том числе и в его личном решении проблемы свободы и ответственности.

В условиях социальных трансформаций современный человек обладает функциональной способностью постигать ценности любви, добра, творчества, усваивать заповеди, ставшие частью общечеловеческого опыта, связывающего людей в единую общность [1, с. 122]. Этот фактор в духовной жизни современности имеет исключительное значение, так как в исторически изменяющихся формах духовности и нравственного сознания поколений проявляется как всеобщее в культуре и социальной практике. Основу христианских ценностей составляют вечные незыблемые начала человеческой жизни, вытекающие из самого существования человека и общества. Стремление общества к реализации всего потенциала своей духовности выступает одновременно как фундамент его устойчивого развития и условие плодотворной человеческой жизни, имеющей цель и смысл. В жизнедеятельности современного белорусского общества христианские ценности, репрезентуя общечеловеческое в духовности, способны выступить как идеальная форма всеобщности, непосредственно обнаруживающая себя в диалоге культур, т. е. как гуманистический опыт, который не нарушает ни права верующих, ни права атеистов. В процессе самоидентификации белорусского народа духовно-нравственные ценности христианства с их конструктивным потенциалом призваны занять доминирующее положение в социокультурном пространстве нашей страны.

**Список цитируемых источников**


1. *Лагуновская, Е. А.* Ценности христианства в формировании нравственной культуры современного белорусского общества : монография / Е. А. Лагуновская. — Брест : БрГУ им. А. С. Пушкина, 2011. — 147 с.
2. *Павловская, О. А.* Система духовно-нравственной безопасности и современного общества : опыт систематизации / О. А. Павловская // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. гуманіт. і грамад. навук. — 2009. — № 3. — С. 5—12.
3. *Франк, С. Л.* Предмет знания. Душа человека / С. Л. Франк. — СПб. : Наука, 1995. — 655 с.
4. *Фромм, Э.* Душа человека / Э. Фромм // Душа человека / Э. Фромм. — М. : Наука, 2004. — С. 235—432.
5. *Фромм, Э.* Искусство любить / Э. Фромм // Душа человека / Э. Фромм. — М. : Наука, 2004. — С. 433—572.
6. *Зеленков, А. И.* Глобальный контекст современной социодинамики и христианские ценности / А. И. Зеленков // Христианские ценности в современной культуре : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 20 дек. 2000 г. : в 2 ч. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: А. И. Зеленков [и др.]. — Минск, 2001. — Ч. 1. — С. 113—115.
7. *Августин, А.* Исповедь / А. Августин // А. Августин. Исповедь. П. Абеляр. История моих бедствий / А. Августин. — М. : Наука, 1992. — С. 8—222.
8. Русская философия. Имена. Учения. Тексты : сборник / сост. Н. В. Солнцев. — М. : ИНФРА-М : Весь мир, 2001. — 496 с.
9. *Пирогов, Н. И.* Избранные педагогические сочинения / Н. И. Пирогов. — М. : Педагогика, 1985. — 496 с.
10. *Ильин, И. А.* Аксиомы религиозного опыта / И. А. Ильин. — М. : Рарогъ, 1993. — 448 с.
11. *Аверинцев, С.* Связь времен / С. Аверинцев. — Киев : Дух і Літера, 2004. — 448 с.
12. *Ясперс, К.* Духовная ситуация времени / К. Ясперс // Смысл и назначение истории / К. Ясперс. — М. : Наука, 1994. — С. 288—418.
13. *Кара-Мурза, С. Г.* Манипуляция сознанием / С. Г. Кара-Мурза. — М. : Алгоритм, 2000. — 681 с.
14. *Поппер, К. Р.* Открытое общество и его враги / К. Р. Поппер. — Киев : Ника-Центр, 2005. — 798 с.


УДК 930.1

**А. У. Літвінскі**
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# ІДЭЙНА-ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ВЫВУЧЭННЯ ЭТНІЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

Этнічная гісторыя Беларусі павінна займаць важнае месца ў структуры ўніверсітэцкага курсу айчыннай гісторыі, незалежна ад таго, якая назва гэтага курсу і ў якой форме ён выкладаецца. Перш за ўсё, гэты імператыў мае абгрунтаванне ў вялікім аксіялагічным значэнні як гістарычнай навукі, так і адпаведнай адукацыі — значэнні, якое ў пэўных выпадках можа набываць уласцівасці экзістэнцыйнага сэнсу. У дадзеным кантэксце слушна было падкрэслена, што «харызматычнасць пазнавальнай функцыі гістарычнай навукі дае падставы для сцвярджэння наступнага зместу: калі чалавек не ведае, напрыклад, геалогіі альбо некаторых іншых навук, ён можа лічыць сябе адукаваным, але пры ўсіх акалічнасцях нельга лічыць сябе такім не ведаючы гісторыі сваёй Бацькаўшчыны, не спасцігшы каштоўнасцей іншых цывілізацый» [1, с. 5].

Этнічныя працэсы, якія адбываліся ў мінулым, прыцягваюць увагу маладых людзей тым, што вывучаючы іх, можна шукаць і знаходзіць адказы на экзістэнцыйныя па сваёй сутнасці пытанні: «Хто мы? Адкуль мы паходзім? Чаму мы такія, якія ёсць?». Зразумела, пошук адказаў на гэтыя пытанні грунтуецца на своеасаблівым, умоўным, хаця б частковым, у пэўнай ступені ірацыянальным атаесамленні «нас сучасных» з «намі ў мінуўшчыне», якое ў нашых уяўленнях выходзіць за межы эмпірычнай штодзённай рэальнасці,

© Літвінскі А. У., 2019

Репозиторий БарГУ

пераадольвае няхай сабе ў фантазіях, няўмольнасць і незваротнасць часу, дэтэрмінаванасць і абмежаванасць асабістага быцця. Пры гэтым амаль што апрыёры сцвярджаецца пра існаванне трывалай повязі паміж продкамі (у тым ліку далёкімі продкамі) і нашчадкамі. Тут маюцца не ўвазе не столькі сапраўдныя біялагічныя продкі (думаецца, мала хто з сучасных студэнтаў упэўнена пералічыць імёны сваіх чатырох прадзядуль і чатырох прабабуль), колькі прадстаўнікі той этнічнай (этнанацыянальнай) супольнасці, з якой сучасны малады чалавек адчувае акрэсленую крыху вышэй па тэксце повязь.

Па сутнасці, на такім атаесамленні грунтуецца пачуццё гонару за славутыя дзеянні продкаў, якое, у сваю чаргу, можа выканаць функцыю актуалізацыі пачуцця маральнага абавязку, а таксама стымуляваць уласную стваральную дзейнасць на карысць Бацькаўшчыны. Узгадаем тут класічны купалаўскі верш «Спадчына», асабліва вось гэтае чатырохрадкоўе, дзе «старонка родная» і наогул усё, назапашанае прадстаўнікамі папярэдніх пакаленняў, паказваецца ў вобразе надзвычай каштоўнага скарбу:

«І ў белы дзень, і ў чорну ноч
Я ўсцяж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з’едзены» [2, с. 264].

Аднак узнікае пытанне: што ў гісторыі Беларусі можна і патрэбна лічыць сваім, а што — чужым? Як намі раней адзначалася, беларуская мінуўшчына стварыла некалькі варыянтаў магчымага культурна-цывілізацыйнага самавызначэння розных сацыяльных груп [3, с. 14]. Па гэтай прычыне ўяўленні пра «нас у мінуўшчыне» могуць быць вельмі рознымі. Адсюль і спрэчкі па пытанні, якое значэнне ў гісторыі наогул і ў этнічнай гісторыі ў прыватнасці мелі для беларусаў ці іх продкаў такія дзяржаўна-палітычныя ўтварэнні, як Кіеўская Русь, Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, Рэч Паспалітая, Расійская імперыя. А ад гэтых уяўленняў шмат у чым залежаць ідэйна-аксіялагічныя прыярытэты сучаснай моладзі і яе канкрэтныя дзеянні (як ты ідэнтыфікуеш сябе ў этнанацыянальным сэнсе, такія і будуць твае паводзіны ў сацыяльна-палітычным кантэксце). Таму этнічная гісторыя Айчыны мае і, напэўна, яшчэ доўга будзе мець бясспрэчную актуальнасць.

Пры гэтым варта адзначыць, што выкладчыкам універсітэтаў, мабыць, трэба добра ўсвядоміць той факт, што не толькі яны, а ў значнай колькасці выпадкаў не яны ў большай ступені фарміруюць свет нацыянальна-гістарычных і, адпаведна, грамадзянска-патрыятычных каштоўнасцей сучасных студэнтаў (асабліва калі ўлічыць зусім малую колькасць акадэмічных гадзін на вывучэнне этнічных працэсаў у курсе гісторыі Беларусі для студэнтаў спецыяльнасцей, не звязаных наўпрост з гістарычнай навукай). Сучасныя юнакі і дзяўчаты, як вядома, «жывуць у Сеціве» і адтуль здабываюць інфармацыю, вельмі часта дэманструючы відавочны брак крытычнасці ва ўспрыманні гэтай інфармацыі, што бачна па каментарах у Інтэрнэце. Таму і выкладаць прафесійным гісторыкам даводзіцца ва ўмовах дастаткова жорсткай ідэйнай канкурэнцыі, якая мае вытокі геапалітычнага характару. Вось чаму дастукацца да душ студэнтаў зможа толькі той выкладчык, які, маючы высокі ўзровень прафесіяналізму (эрудыцыю, майстэрства лектара, валоданне найбольш прыдатнымі дыдактычнымі метадамі), яшчэ і здольны набыць у студэнтаў асобасны аўтарытэт, каб яго аўдыторыя сустракала і ўспрымала не як чыноўніка сістэмы адукацыі, які адпрацоўвае гадзіны вучэбнай нагрузкі, а як Настаўніка з вялікай літары.

Актуальнасць этнічнай гісторыі і запатрабаванасць ведаў па ёй маюць адваротны бок. Як адзначае вядомы расійскі даследчык В. А. Шнірэльман, «у сучасных умовах усеагульнай пісьменнасці фарміраванне этнічнай ідэнтычнасці ўсё часцей абапіраецца на навуковыя тэхналогіі», аднак «грамадства атрымлівае такія веды далёка не заўсёды наўпрост ад навукоўцаў, а часцей — ад пасярэднікаў-дылетантаў або ўмелых маніпулятараў» [4, с. 5] *(тут і далей пераклад з рускай на беларускую мову наш — **А. Л.**)*. Іншымі словамі, поруч з аб’ектыўнай навуковай інфармацыяй, на вялікі жаль, дастаткова ўпэўнена крочыць неўсвядомленая ці, наадварот, свядомая міфатворчасць. І гісторыкам даводзіцца супрацьстаяць гэтай досыць агрэсіўнай і безапеляцыйнай міфатворчасці, часам нават і змагацца з ёй, зразумела, даступнымі і карэктнымі сродкамі.

Праўда, могуць даволі слушна запярэчыць, што спадзяванні на поспех азначанага змагання марныя, паколькі масавая свядомасць у этнанацыянальнай галіне фактычна заўсёды функцыянуе па законах міфалагічнага мыслення. Для апошняга характэрныя такія рысы: дуалізм ва ўспрыманні рэчаіснасці, калі свет нібыта малюецца толькі чорнай і белай фарбамі (пры гэтым, зразумела, белай фарбай прадстаўнікі той або іншай супольнасці маркіруюць сябе, а чужынцаў — адпаведна, чорнай); згаданая вышэй адсутнасць крытычнасці, што выяўляецца ў імкненні да простых і адназначных адказаў на складаныя пытанні; стэрэатыпнасць і рыгіднасць (на думку вядомага беларускага культуролага і этнолага Ю. В. Чарняўскай, этнічныя стэрэатыпы немагчыма пераадолець, таму «размова павінна ісці не пра выкараненне стэрэатыпаў, а пра напаўненне гетэрастэрэатыпаў больш пазітыўным зместам» [5, с. 485]); падмена сувязі прычын і наступстваў простай храналагічнай паслядоўнасцю («па прычыне гэтага, таму што пасля гэтага»); блытаніна паміж падабенствам і тоеснасцю; перанос пэўных рыс міжасобасных адносін на значна больш складаныя грамадскія працэсы (у нашым выпадку гэта выяўляецца ў пастулаце, паводле якога этнічныя супольнасць параўноўваюцца з жывымі арганізмамі, якія знаходзяцца або не знаходзяцца ў больш ці менш блізкіх роднасных сувязях).

Разбяром гэтыя асаблівасці міфалагічнага мыслення на прыкладзе вельмі складанай для вырашэння праблемы паходжання беларусаў [6, с. 99—106, 125—148, 323—330; 7, с. 541—567; 8]. У навуцы існуе некалькі асноўных канцэпцый этнагенезу беларусаў, і цяжка якой-небудзь з іх аддаць відавочную і адназначную перавагу. Да таго ж даследаванню гэтай праблемы ўласцівая даволі высокая ступень дынамізму: перыядычна



Рэпазіторый БарДУ

абнаўляецца інфармацыя археалагічнага паходжання, усё большае значэнне ў дадзеным даследаванні набывае папуляцыйная генетыка, удакладняюцца метадалагічныя пазіцыі навукоўцаў. А між тым спажывец гістарычнай інфармацыі арыентаваны на яе атрыманне «тут і зараз», так бы мовіць, у стэрылізаваным, ачышчаным ад залішняй рэфлексіі выглядзе. Напрыклад, ён ставіць пытанне рубам: беларусы — гэта балты ці славяне? І вельмі няпроста яму растлумачыць змест такіх тэрмінаў, як «балта-славянская праблема», «субстрат», «культурная дыфузія», «этнамоўная асіміляцыя», «славянізацыя» і да таго падобных, ва ўсялякім разе, растлумачыць на ўзроўні дастатковай навуковасці, без прафанацыі (і калі ён сам для сябе тлумачыць, і калі ў адносінах да яго гэта робіць іншы чалавек з адпаведнай кваліфікацыяй).

Зразумела, можна проста зазначыць, што беларусы — безумоўна, славяне па факце месца беларускай мовы ў лінгвістычнай класіфікацыі, і на гэтым перапыніць дыскусію. Аднак нават знакамітыя, аўтарытэтныя археолагі разважаюць над пытаннем аб верагоднай славянскасці той або іншай археалагічнай культуры, хаця яны выдатна ведаюць пра тое, што гэтыя культуры утварыліся задоўга да таго гістарычнага моманту, калі славянская мова была зафіксаваная ў пісьмовых крыніцах, і, адпаведным чынам, пра этнічную атрыбуцыю «нямых» археалагічных культур, якія былі пакінутыя магчымымі продкамі гістарычных славян, размову трэба весці вельмі асцярожна, калі наогул гэта рабіць мэтазгодна. Што ўжо казаць пра людзей, амаль зусім не абазнаных у цяжкавырашальных пытаннях этнагенезу, да таго ж маючых жаданне ставіцца да мінуўшчыны ў адпаведнасці з этнічнымі стэрэатыпамі і іншымі забабонамі міфалагічнага мыслення?

Трэба ўлічваць яшчэ адзін аспект, дарэчы, вельмі непрыемны і трывожны. Пад лозунгам аднаўлення гістарычнай праўды і «вяртання да каранёў» перыядычна вядуцца атакі на сучасную беларускую нацыянальна-гістарычную самасвядомасць і на беларускую этнанацыянальную ідэнтычнасць. Насамрэч ініцыятараў гэтых атак якраз гістарычная праўда цікавіць, мякка кажучы, не заўсёды. Як адзначае вядомы беларускі даследчык І. А. Марзалюк, у дадзеным рэчышчы сцвярджаецца, напрыклад, аб амаль выключна балцкай сутнасці мясцовых жыхароў, аб іх адвечным паганстве і фактычна ігнаруецца далейшая, славянская і хрысціянская, гісторыя Беларусі, што, уласна кажучы, вынікае з іх праграмных твораў, цытаты з якіх шырока выкарыстоўваюцца даследчыкам у сваёй працы [9, с. 46]. Тут, на грунце своеасаблівага «замілавання аўтахтанізмам» і захаплення этнакультурнай архаікай, мы бачым спробу гіперпрымардыялісцкага атаесамлення паходжання этнасу, якое ў дадатак яшчэ і паказваецца аднабакова, тэндэнцыйна, з яго нібыта нязменнай сутнасцю, ад пачатку і назаўсёды вызначанай ужо самым фактам паходжання. І. А. Марзалюк, даволі жорстка крытыкуючы такую пазіцыю («непаліткарэктна і неліберальна», як ён сам зазначае з пэўным сарказмам), сцвярджае: «Разбор квазінавуковых аргументаў беларускіх неапаганцаў-балтаў — няўдзячная і марная рэч. Але ў іх выпадку мы маем справу з даўняй беларускай інтэлігенцкай хваробай — нацыянальнай фрустрацыяй, імкненнем адмовіцца ад рэальна існуючай традыцыі, а значыць, і ад сваёй спадчыннай беларускасці, са спробай атаясаміць сябе з больш паспяховым, атрымаўшым больш высокі ўзровень сацыяльнай сатысфакцыі, суседам» [9, с. 47].

Міфалагізацыя гістарычнай рэчаіснасці непазбежна вядзе да спрашчэння ўяўленняў аб працэсах, якія адбываліся ў мінулым. Апынуўшыся ў віры інфармацыйных плыняў, студэнт, які шчыра цікавіцца мінуўшчынай, можа пайсці за правадырамі сумнеўнай вартасці, нават не заўважыўшы і крытычна не ўсвядоміўшы гэтага. Што ў такой сітуацыі трэба рабіць выкладчыку? З належнай цярплівасцю тлумачыць, як на лекцыях, так і на семінарах, што ў гісторыі заўсёды дзейнічаюць даволі супярэчлівыя тэндэнцыі і этнагенез беларусаў у гэтым сэнсе не выключэнне. Наш этнас мае гетэрагеннае паходжанне (як і шмат якія іншыя этнасы — выключэнні з гэтага правіла вельмі рэдкія, фактычна адзінкавыя), а яго этнічная гісторыя адбывалася ва ўмовах полікультурнасці (дастаткова ў гэтым кантэксце нагадаць пра традыцыйную шматканфесійнасць і рэлігійную талерантнасць нашых продкаў). Таму пастуляваць нейкі там этнічны пурызм у лепшым выпадку смешна, у горшым — надзвычай небяспечна у першую чаргу для нас саміх.

Разам з тым неабходна, каб маладыя людзі добра ўсведамлялі адметнасць беларускага этнасу, бо ў гэтай адметнасці — глыбінныя вытокі нашай дзяржаўнасці, найважнейшы аргумент на карысць яе існавання. Таму вялікае значэнне ў працэсе выхавання патрыятызму і грамадзянскасці мае паказ сродкамі гістарычнай навукі таго пакручастага шляху да нацыі і ўласнай дзяржавы, які адолела беларуская этнічная супольнасць, і перыяду нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва (другая палова XIX — пачатак XXI ст.) неабходна заняць сваё пачэснае месца ў адпаведных вучэбных праграмах. Нагадаем у гэтай сувязі, што вышэйшая школа павінна ў прынцыпе рыхтаваць нацыянальную эліту з адпаведным узроўнем нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці (гэта імператыў сучаснасці, шмат у чым абумоўлены працэсамі геапалітычнага паходжання), і па гэтай прычыне авалоданне студэнтамі ведаў па этнічнай гісторыі Айчыны павінна быць грунтоўным.

Ва ўмовах адзначанай вышэй традыцыйнай беларускай полікультурнасці (не трэба ў дадзеным кантэксце блытаць яе з сучаснай еўрапейскай мультыкультурнасцю, супярэчлівай і неадназначнай) беларуская нацыя складвалася пераважна як палітычная нацыя, аднак з выразнаю этнічнаю асноваю. Яе складнікамі сталіся розныя этнічныя групы. Як канкрэтныя і яскравыя прыклады ўнёску прадстаўнікоў іншых этнасаў у пабудову трывалага і ўтульнага Беларускага дома ўзгадваюцца асобы этнічнага яўрэя Сымона Плаўніка (літаратурны псеўданім — Змітрок Бядуля) і ўраджэнца ўральскага рэгіёну Расіі Уладзіміра Мулявіна. Гэтая тэндэнцыя мае працяг і ў наш час. Адпаведным чынам, у межах выкладання этнічнай гісторыі Беларусі варта звяртаць увагу на факты канструктыўнага этнічнага ўзаемадзеяння.

Такім чынам, вывучэнне этнічнай гісторыі Беларусі мае вялікі ідэйна-выхаваўчы патэнцыял, асабліва ў галіне грамадска-патрыятычнага выхавання. Аднак па прычыне надта ўжо адчувальнага недахопу акадэмічных гадзін на вывучэнне дадзенага комплекса пытанняў у курсе айчыннай гісторыі мэтазгодна прапанаваць увесці



Рэпазіторый БарДУ

адпаведную дысцыпліну ў вучэбныя планы спецыяльнасцей, перш за ўсё гуманітарна-педагагічнага профілю (няхай яна так і будзе называцца — «Этнічная гісторыя Беларусі», хаця, як варыянт, можна прапанаваць і нейкую іншую назву). Дадзеная прапанова мае сваё абгрунтаванне ў тым факце, што выпускнікі ўніверсітэтаў, якія атрымалі педагагічную кваліфікацыю, будуць выхоўваць юных грамадзян беларускай дзяржавы, і ад таго, наколькі гэтае выхаванне будзе эфектыўным, залежыць лёс Беларусі як дзяржавы і беларускага народу як нацыі (ні больш, ні менш). Каго мы выхаваем, такую і долю мы будзем мець.

Сярод пытанняў, якія неабходна вывучаць у межах азначанага вышэй універсітэцкага курсу, трэба назваць наступныя: этнічная супольнасць, яе асноўныя характарыстыкі; класіфікацыя этнічных супольнасцей у сучаснай гуманітарыстыцы; беларусазнаўства як вобласць міждысцыплінарных навуковых даследаванняў, асноўныя этапы развіцця беларусазнаўства, яго гістарычнае значэнне ў кантэксце этнічнай гісторыі; геаграфічныя асаблівасці Беларусі, іх уплыў на этнічныя працэсы і гістарычнае развіццё краіны; перадумовы і пачатак этнагенезу беларусаў; роля балтаў у этнагенезе беларусаў; паходжанне і пачатковая гісторыя славян; асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў, іх параўнальная характарыстыка; гістарычная трансфармацыя беларускага этнасу ў дзяржаўных утварэннях, якія ўключалі ў сябе тэрыторыю Беларусі; самаідэнтыфікацыя і саманазвы продкаў беларусаў у мінулым; фарміраванне ментальнасці і нацыянальнага характару беларусаў; рэлігійна-канфесійныя адносіны на тэрыторыі Беларусі, іх уплыў на этнічныя працэсы; пачатак фарміравання беларускай нацыі, узнікненне і развіццё беларускага нацыянальнага руху; узаемасувязь беларускага нацыянальнага і дзяржаўнага будаўніцтва; гістарычныя і сучасныя тыпы нацыянальнай самасвядомасці беларусаў; этнічныя групы і міжэтнічныя адносіны на тэрыторыі Беларусі ў мінулым; беларуская этнанацыянальная супольнасць ва ўмовах геапалітычных працэсаў і выклікаў пачатку XXI стагоддзя [10].

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. А. А. Кавалені, В. Ф. Касовіча. — Мінск : БДПУ, 2004. — Ч. 1. — 150 с.

2. *Купала, Я.* Выбраныя творы / Я. Купала ; уклад. У. Гніламёдава, А. Шамякінай ; прадм. Н. Гілевіча ― Мінск : Беларус. кнігазбор, 2002. — 640 с. (8) с. : іл. — (Беларускі кнігазбор. Сер. 1 : Мастацкая літаратура).

3. *Літвінскі, А. У.* Працэс трансфармацыі нацыянальна-гістарычнай самасвядомасці беларусаў у канцы XX — пачатку XXI стагоддзя / А. У. Літвінскі // Трансформационные процессы в белорусском обществе в Новейшее время. Дню независимости Республики Беларусь посвящается : материалы Респ. науч.-практ. конф., 18 апр. 2014 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Демидович (отв. ред.) [и др.]. —— Барановичи : РИО БарГУ, 2014. — С. 13—18.

4. *Шнирельман, В. А.* Арийский миф в современном мире / В. А. Шнирельман. — М. : Новое литератур. обозрение, 2015. — Т. 1. — 536 с.

5. *Чернявская, Ю. В.* Белорусы. От «тутэйшых» — к нации / Ю. В. Чернявская. Минск : ФУАинформ, 2010. — 512 с. : ил.

6. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Экаперспектыва, 2000—2005. — Т. 1 : Старажытная Беларусь : Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — 2000. — 351 с.

7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Экаперспектыва, 2000—2005. — Т. 2 : Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоускага / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — 2008. — 688 с.

8. *Пилипенко, М. Ф.* Возникновение Белоруссии: новая концепция / М. Ф. Пилипенко. — Минск : Беларусь, 1991. — 132 с.

9. *Марзалюк, І. А.* Міфы «адраджэнскай» гістарыяграфіі Беларусі : манаграфія / І. А. Марзалюк. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. — 148 с.

10. *Літвінскі, А. У.* Беларусазнаўства : метад. рэкамендацыі для студэнтаў устаноў выш. адукацыі / А. У. Літвінскі. — Баранавічы : РВА БарДУ, 2015. — 59 с.



УДК 101.8



**Е. Г. Максимук**

Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно


## СВОБОДА И ОТВЕТСТВЕННОСТЬ СОВРЕМЕННОГО ЧЕЛОВЕКА

В современном обществе тематика свободы и ответственности — это центральные темы как в политической сфере, так и в духовной. Этим понятиям предаются различные значения и смысл, в зависимости от общества, группы, передаваемых ценностей, идеалов, убеждений, знаний и традиций от поколения к поколению. Понятия «свобода» и «ответственность» следует рассматривать как взаимосвязанные, но взаимоисключающие категории. Для того чтобы наиболее точно определить значения данных понятий, следует учитывать факторы, влияющие на развитие общества. Именно они задают рамки свободы и ответственности.

Понятия «свобода» и «ответственность» связаны между собой и определяют понимание друг друга. Довольно сложно дать одно конкретное определение этим понятиям, так как в каждом государстве, общности, обществе, группе свое понимание свободы, а следовательно, и ответственности. Что в одном государстве является доступным, в другом может быть запрещено. В каждом государстве рамки свободы определяются через нормативно-правовые акты и далее человек уже самостоятельно определяет свои собственные рамки свободы,


© Максимук Е. Г., 2019



Репозиторий БарГУ